


# ЖЫЦЦЁВАЯ ШКОЛА ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

**Выйшла з друку чарговае выданне з тэматычнай кніжнай серыі «Зоркі Гродзенскага спорту». Аўтарам дакументальнай аповесці «На лініі жыцця. Аповесць пра Уладзіміра Лебедзева» (выдавецтва «ЮрСаПрынт», Гродна, 2023) з’яўляецца член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы журналіст, паэтэса, публіцыст Тамара Мазур.**

***

«У кнізе апавядаецца пра настаўніка фізічнай культуры Уладзіміра Лебедзева, які заваяваў тытул чэмпіёна па кіданні кап’я на першай беларускай спартакіядзе ў 1956 годзе. А перад тым прайшоў жыццёвую школу ў міжваенны і ваенны перыяды ў маленькіх вёсачках на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры, на працы ў Віцебску і падчас вайсковай службы ў ГДР. Чытач дазнаецца пра выхаванне падрастаючага пакалення з дапамогай спалучэння фізічнай культуры і высокіх маральных якасцей, пачарпне цудоўны вопыт здаровага ладу жыцця доўгажыхара і яго паслядоўнікаў. Кніга «На лініі жыцця адрасуецца школьнікам, будучым спартсменам, настаўнікам фізічнай культуры, трэнерам і шырокаму колу чытачоў”». *(Анатацыя).*

## Яго прызванне – настаўнік



Уладзімір Аляксеевіч Лебедзеў – ветэран фізічнай культуры і спорту БССР (1983 г.), чэмпіён БССР па кіданні кап’я (1956 г.), выдатнік народнай асветы(1964 г.), настаўнік-метадыст (1984 г.), Заслужаны настаўнік БССР і Рэспублікі Беларусь (1986 г. і 1996 г.). Узнагароджаны медалямі “За доблесную працу”, “Ветэран працы” і Ганаровым знакам за развіццё фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь.

Закончыў Гродзенскі тэхнікум фізічнай культуры (1951 г.) і Мінскі інстытут фізічнай культуры (1958 г.). Працоўны шлях пачаў настаўнікам фізічнай культуры рамесніцкага вучылішча фабрычна-завадской адукацыі ў Віцебску. У 1955 г., пасля тэрміновай службы ў войску

вярнуўся на малую радзіму і да 2006 г. працаваў настаўнікам фізічнай культуры Жытамлянскай сярэдняй школы на Гродзеншчыне – палову стагоддзя. На заслужаным адпачынку стварыў Клуб аматараў бегу "Бадзёрасць", які з цягам часу набыў статус абласнога.

Многія вучні Уладзіміра Аляксеевіча пайшлі па яго слядах і шчыра ўдзячны свайму настаўніку за выдатную спартыўную падрыхтоўку, прывітую любоў да фізічнай культуры, за тое, што навучыў пераадольваць перашкоды і ніколі не пасаваць перад цяжкасцямі.

Поруч з ім больш шасцідзесяці гадоў крочыць па жыцці жонка Галіна Мікалаеўна Лебедзева, таксама настаўніца, былы арганізатар пазашкольнай работы, выпускніца Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы. Яе настаўніцкі стаж у Жытамлянскай школе – 45 гадоў. З такой надзейнай паплечніцай Уладзімір Лебедзеў цягнуў і "воз" розных грамадскіх нагрузак, быў членам прэзідыума Гродзенскага райкама прафсаюзаў, вёў класнае кіраўніцтва, спартыўныя секцыі, прыклаў шмат намаганняў для ўдасканалення школьнай матэрыяльна-спартыўнай базы.

Аднойчы, сумiраваўшы свае дасягненні, Уладзімір Аляксеевіч вырашыў сесці за пісьмовы стол. Натхненне часцей за ўсё прыходзіла да яго пад пошум дажджу, што празрыстымі вадзянымі сцяжынкамі сцякала па ваконным шкле, настройваючы на лірычны лад. На паперу кладліся разважанні пра неабходнасць спалучэння фізічнай культуры з духоўнай, пра сумленне і годнасць, здаровы лад жыцця і інш.

Гэтыя запісы трапілі ў рукі да прафесійнага журналіста, паэта, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамары Мазур. Кіруючыся імі, як дапаможнікам, Тамара Міхайлаўна правяла шмат гутарак з героем кнігі і яго вучнямі. Засяродзіла ўвагу на фарміраванні асобы настаўніка, пачынаючы з урокаў, дадзеных яму перш-наперш бацькамі.

Дзякуючы таму, што Уладзімір Лебедзеў падчас вучобы змяніў некалькі школ, праз яго біяграфію прасочваецца гісторыя вясковай адукацыі на Гродзеншчыне з 1937 г. і амаль да нашых дзён. У кнізе "На лініі жыцця" чытач дазнаецца пра падрыхтоўку настаўнікаў у Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры ў пасляваенныя гады, спартыўныя спаборніцтвы савецкіх вайскоўцаў у Германіі, першую беларускую спартакіяду.

Герой кнігі "На лініі жыцця" Уладзімір Аляксеевіч Лебедзеў працаваў не ў ідэальных умовах, асабліва ў пасляваенныя гады, аднак яго любоў да фізічнай культуры і здаровага ладу жыцця запаліла іскрынкі бадзёрасці ў многіх вучняў на ўсё жыццё.

**Людміла КЕБІЧ,**

**старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення**
**ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі»**

***



**Для даведкі**

Аўтар кнігі Тамара МАЗУР – член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст, лаўрэат Гродзенскай абласной прэміі імя Аляксандра Дубко «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва». Аўтар кніг паэзіі і публіцыстыкі: «Спакуса траўня» (1995 г.), «Ваўкавыск – радзімка Беларусі» (2005 г.), «Пакуль кахаю…» (2013 г. ), «Скидляне. Скидельцы, Скидельчане» (2021 г.), «Як мае быць…» (2021 г. ), «На лініі жыцця. Аповесць пра Уладзіміра Лебедзева» (2023 г.). Друкавалася ў часопісах, альманахах, калектыўных зборніках, перакладалася на мовы суседніх краін. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і звыш трыццаці гадоў працавала на розных пасадах у рэдакцыях рэспубліканскіх і рэгіянальных газет.

Кніга Тамары Мазур «На лініі жыцця. Аповесць пра Уладзіміра Лебедзева» з’яўляецца 9-м па ліку выданнем з тэматычнай кніжнай серыі «Зоркі Гродзенскага спорту». Аповесць багата ілюстравана каляровымі і чорна-белымі архіўнымі фотаздымкамі. Пераплёт цвёрды. На старонках кнігі яе аўтар, беларуская пісьменніца са Скідзеля Тамара Міхайлаўна Мазур здолела праявіць сябе ў розных творчых амплуа – як журналіст, публіцыст і як майстар мастацкага слова. Адкрывае кнігу верш паэтэсы «Вершапартрэт Уладзіміра Лебедзева».

Кніжная серыя «Зоркі Гродзенскага спорту» складаецца з мастацка-публіцыстычных кніг сучасных пісьменнікаў Гродна і Гродзенскай вобласці аб прадстаўніках спартыўнага свету. У 2015 годзе праект быў ініцыяваны кіраўніком прадстаўніцтва Нацыянальнага Алімпійскага камітэта па Гродзенскай вобласці Аляксандрам Мікалаевічам Курловічам і з тых часоў паспяхова рэалізуецца Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі. Рэдактар серыі С. І. Бяззубаў.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**